Комитет по делам религий и национальностей
при Совете Министров Республики Беларусь,
Республиканский центр национальных культур,
Министерство культуры Республики Беларусь,
Всемирный конгресс татар,
Международный фонд развития
татаро-башкирского духовного наследия «Чишма»,
Белорусское общественное объединение татар «Зикр уль-Китаб»

# УЧАСТИЕ ТЮРКСКИХ НАРОДОВ И НАРОДОВ КАВКАЗА В ВЕЛИКОЙ ОТЕЧЕСТВЕННОЙ ВОЙНЕ 1941-1945 гг.

**К 60-летию освобождения Беларуси
от немецко-фашистских захватчиков
и Победы советского народа
в Великой Отечественной войне**

**Материалы X международной
научно-практической конференции**

Репозиторий БГПУ

**Минск
2004**

Эйзенхауэра. М., 1990; Черчилль У. Вторая мировая война. Т. 1-3. М., 1990; Урланис Б.Ц. История военных потерь (XV11-XX вв.). Спб., 1994; Вторая мировая война: Два взгляда. М., 1995; Вторая мировая война. Дискуссии. Основные тенденции. Результаты исследований. М., 1997; Итоги второй мировой войны. Выводы побеждённых. Спб.- М., 1998; Фишер В. Европа: экономика, общество и государство. 1914-1980. М., 1999; Лиддел Гарт Б. Вторая мировая война. Спб.- М., 1999; Гренвилл Дж. История XX века. Люди. События. Факты. М., 1999; Новейшая история стран Европы и Америки. XX век: Учеб. для студ. высш. учеб. заведений: В 2-х ч. / Под ред. А.М. Родригеса, М.В. Пономарёва. М., 2001. Ч.1. 1900-1945; Уткин А.И. Вторая мировая война. М., 2002.

2. См.: Дугин А. Основы геополитики. Геополитическое будущее России. М., 1997; Генон Р. Кризис современного мира. М., 1994; Гаджиев К.С. Введение в геополитику. Учебник для вузов. М., 1998; Человек. Общество. Государство: Пособие для абитуриентов вузов / Под ред. А.И. Авраменко, Ф.В. Пекарского. Мн., 2003. С. 91, 96-97.

3. См.: История новейшего времени стран Европы и Америки: 1945-2000 гг. Учеб. пособие / Под ред. Е.Ф. Язькова. М., 2001; Человек. Общество. Государство. Указ. соч. С. 68-71.

4. См.: Беларуская энцыклапедыя ў 18 тамах. Т. 4. Мн., 1997. С. 378.

5. См.: Там же. С. 378.

6. См.: "Совершенно секретно! Только для командования!". Стратегия фашистской Германии в войне против СССР. Документы и материалы. М., 1967; Откровения и признания. Нацистская верхушка о войне "третьего рейха" против СССР. Секретные речи. Дневники. Воспоминания. Смоленск, 2000.



## УДЗЕЛ НАРОДАЎ САВЕЦКАГА САЮЗА Ў ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЕ (ЧЭРВЕНЬ 1941 – МАЙ 1945 гг.)

**Канапацкі І.Б., Шкуцько Л.Л., Шкуцько П.Л. (Мінск)**

З першых дзён Вялікай Айчыннай вайны супраць гітлераўскіх захопнікаў разгарнулася жорсткая барацьба, у якой прымалі ўдзел усе народы краіны. Больш месяца змагаўся акружаны захопнікамі гарнізон Брэсцкай крэпасці. Сярод 3,5 тысяч яе абаронцаў былі воіны 30 нацыянальнасцей. Асабістую мужнасць і гераізм, напрыклад, праявілі тут рускія І.Зубачоў, А.Вінаградаў, армянін С.Мацевасян, азербайджанец А.Абдулаеў, грузін В.Зедгеніддзе, беларус У.Шаблоўскі, украінец Р.Семянюк і многія іншыя салдаты і афіцэры. У складзе Чырвонай Арміі дзейнічалі гвардзейскія казахскія дывізіі, эстонскі корпус, латышская, літоўская дывізіі і г.д. Так, у баях пад Масквой мужна змагаліся байцы 201-й латышскай дывізіі, перайменаванай за гераізм у 43-ю гвардзейскую, 316-я стралковая дывізія начале з генералам І.В.Панфілавым, сфарміраваная ў Казахстане. 258-я стралковая, 21-я і 44-я дывізіі прыбылі з Узбекістана, 40-я стралковая брыгада – з Кіргізіі, 385-я стралковая брыгада – з Туркменіі. За баявы гераізм, праяўлены пры абароне Тулы і вызваленні Вологды 258-я дывізія стала ў студзені 1942 г. гвардзейскай.

У 1942 г. у баявыя дзеянні ўступілі 8-ы эстонскі корпус, 16-я літоўская стралковая дывізія, 112-я башкірская кавалерыйская брыгада, якая ўдзельнічала ў вызваленні Беларусі. За свае баявыя подзвігі брыгада была ўзнагароджана ардэнамі Леніна, Чырвонага Сцяга, Суворава, Кутузава (1; 90). Шматнацыянальныя воінскія злучэнні былі створаны ў Грузіі (349, 276, 392 і іншыя стралковыя дывізіі), Азербайджане (402, 416 і іншыя стралковыя дывізіі), 89, 390, 261 і іншыя стралковыя дывізіі ў Арменіі. Больш паловы асабовага складу 195-й стралковай дывізіі, сфарміраванай у Чкалаўскай вобласці, складалі казахі і татары. Толькі з жыхароў Казахстана было сфарміравана і адпраўлена на фронт больш 12 дывізій і асобных брыгад. Тры кавалерыйскія дывізіі, 2 стралковыя брыгады і некаторыя іншыя злучэнні былі сфарміраваны на тэрыторыі Таджыкістана (2; 35-50).

Усяго ў гады вайны было сфарміравана больш 60 нацыянальных воінскіх фарміраванняў, у тым ліку 2 стралковыя карпусы, 20 стралковых і 20 кавалерыйскіх дывізій, 15 асобных стралковых брыгад, 1 авіяцыйны полк і інш. (3; 90). Толькі ў склад



Рэпазіторый БДПУ

генералітэту і афіцэрскага саставу ўваходзілі прадстаўнікі больш 50 нацый – рускія Г.Жукаў, А.Радзімцаў, В.Чуйкоў, украінец А.Чарняхоўскі, узбек С.Рахімаў, асецін І.Плііеў, латыш Я.Фогель, літовец Ф.Жэмайціс, армянін Г.Баграмян і інш. К пачатку 1943 г. сярод толькі афіцэраў ВПС знаходзілася разам з рускімі 28 тысяч украінцаў, больш 5 тысяч беларусаў, больш 1000 татар, 800 грузін, больш 400 чувашоў, звыш 380 прадстаўнікоў Мардовіі. Сярод тых, хто праславіў краіну талентам палкаводца і асабістай мужнасцю, былі і выхадцы з Беларусі В.Сакалоўскі, А.Антонаў, І.Якубоўскі, С.Красоўскі, А.Бацюня і многія іншыя.

Сярод 11603 воінаў – Героеў Савецкага Саюза былі прадстаўнікі 100 нацый і народнасцей. У тым ліку – 8160 чалавек рускіх, 2069 украінцаў, 443 беларусы, сярод якіх 8 дачок нашага народа – Е.Зянькова, А.Мазанік, А.Маслоўская, А.Стэмпкоўская, З.Тусналобава, М.Осіпава і інш, 161 татарын, 108 яўрэяў, 96 казахаў, 90 грузін, 40 армян, 69 узбекаў, 61 мардвінаў, 44 чувашоў, 44 азербайджанцаў, 39 башкіраў, 32 асецінаў і г.д. (4; 159). Больш 200 прадстаўнікоў розных народаў паўтарылі подзьвіг А.Матросава, 70 – М.Гастэлы, больш 600 здзейнілі паветраны таран. Сярод двойчы Герояў Савецкага Саюза былі 4 беларусы – П.Я.Галавачоў, С.І.Грыцавец, І.Гусакоўскі, І.Якубоўскі, а таксама прадстаўнікі іншых народаў – С.Амет Хан, І.Баграмян, І.Плііеў, Ц.Хрукін, І.Чарняхоўскі, А.Нядбайла і інш. (5; 520). Героямі Савецкага Саюза сталі 88 падпольшчыкаў і партызан Беларусі, больш 60 воінаў – ураджэнцаў рэспублікі – каалерамі ордэна Славы трох ступеняў.

У партызанскай барацьбе на тэрыторыі Беларусі прымалі ўдзел прадстаўнікі 73 нацый і народнасцей. Побач з беларусамі (71,9%) змагаліся рускія – 19,29%, украінцы – 3,9%, яўрэі – 2,8%, а таксама літоўцы, латышы, узбекі, грузіны і многія іншыя (6). Актыўнымі арганізатарамі і ўдзельнікамі барацьбы з нямецка-фашысцкімі захопнікамі у радах народных мсціўцаў разам з беларусамі В.Каржом, І.Клімавым, П.Машэравым, Р.Магульскім і інш. былі прадстаўнікі рускага народа В.Лівенцаў, П.Канавалаў, Р.Такуеў, М.Канстанцінаў, украінцы І.Цімчук, А.Нікалаеў, У.Шчарбіна, карачаевец А.Касаеў, казах Г.Ахмедзьяраў, таджык І.Таіраў, марыец Р.Ахоцін, грузін У.Талакваддзе і многія іншыя.

Толькі ў партызанскай брыгадзе “Разгром”, якая дзейнічала ў Мінскай вобласці, было прадстаўлена больш чым 25 нацыянальнасцей, а ў брыгадзе імя Данукалава на Віцебшчыне – 21, а ў брыгадзе імя В.Чкалава Баранавіцкай вобласці – 29. Камандзірам брыгады быў рускі М.Грыбанаў, камісарам – беларус І.Казак, нач. штаба – украінец І.Аніщчанка, разведку ўзначальваў



абхазец Д.Зуэба, атрадамі камандавалі карачаевец К.Кінкееў і татарын В.Шакіраў. Усяго ў складзе брыгады змагалася 638 беларусаў, 292 рускія, 47 украінцаў, больш 100 прадстаўнікоў іншых нацыянальнасцей (7; 50-51). У летапісу славы беларускага народа перыяду ваенных гадоў ганаровае месца займае імя партызана-казаха Ж.Маматава. Сем ордэнаў і медаляў, у тым ліку і ордэн Леніна, гавораць аб яго баявых подзьвігах. У Кобрынскім раёне страх на гітлераўцаў наводзіла інтэрнацыянальная рота імя С.Кірава, якой камандаваў узбек Уракаў. На баявым рахунку роты больш 1600 забітых гітлераўцаў, 10 разгромленых варожых гарнізонаў, 15 пушчаных пад адгон эшалонаў праціўніка. Усе байцы гэтай роты мелі ўрадавыя ўзнагароды, а камандзір – ордэн Чырвонай Зоркі і медаль “За адвагу” (8; 32). Першым Героем Савецкага Саюза сярод партызан-камандзіраў яшчэ 6 жніўня 1941 г. разам з беларусам Ц.Бумажкавым стаў украінец Ф.Паўлоўскі (9). Подзьвігі партызан і падпольшчыкаў Беларусі былі высока ацэнены краінай: звыш 120 тысяч партызан і падпольшчыкаў рэспублікі ўзнагароджаны ардэнамі і медалямі, а 88 з іх удастоены высокага звання Героя Савецкага Саюза. З іх – 45 беларусаў, 30 рускіх, 9 украінцаў, карачаевец А.Касаеў, літовец С.Ваўпшасаў, узбек М.Таывалдыеў і інш.

У той жа час прадстаўнікі Беларусі мужна змагаліся ў радах народных мсціўцаў іншых абласцей і рэспублік краіны. Напрыклад, сярод украінскіх партызан 6% былі беларусы.

Прадстаўнікі розных народаў і нацыянальнасцей удзельнічалі і ў вызваленні Беларусі, здзейніўшы пры гэты шматлікія подзьвігі. Гэта рускія – лётчык, двойчы Герой Савецкага Саюза Л.Бяда, Героі Савецкага Саюза А.Гарбатаў, П.Ротмістраў, С.Роман, які паўтарыў подзьвіг А.Матросава, А.Асадчы і інш., украінцы А.Бурдзейны, танкавае злучэнне якога першым уварвалася ў Мінск, П.Рак, танкавы экіпаж якога ў складзе А.Пятраева і А.Данілава першым уварваўся ў Барысаў і амаль ноч вёў баі з гітлераўцамі, В. і С.Супрун, яўрэі – І.Бескін, З.Гарэлік, тувінец М.Бухтуеў, мардвін І.Болдзін і многія іншыя.

За баявыя подзьвігі, здзейсненыя пры вызваленні рэспублікі, 1631 воін атрымаў высокае званне Героя Савецкага Саюза. З іх – 1162 рускія, 235 украінцаў, 39 беларусаў, 29 татар, 26 казахаў, 20 узбекаў, 18 башкір, больш 100 прадстаўнікоў іншых народаў. Сярод іх рускія Ю.Смірноў, якога гітлераўцы параненага захапілі ў палон непадалёку ад Оршы і не дабіўшыся ад яго ніякіх звестак, распялі на сцяне бліндажа, К.Захараў, М.Калінкін, А.Пятраеў, украінцы П.Мірашнічэнка, К.Гнідаш, казах С.Іскаліеў, узбек Г.Якубаў,



Репозиторий БГПУ

азербайджанец А.Саркісаў і іншыя, звыш 400 тысяч воінаў былі ўзнагароджаны ардэнамі і медалямі. Усюды пры фарсіраванні Заходняй Дзвіны і Дняпра, Бярэзіны і Нёмана, вызваленні Віцебска, Гомеля і іншых мясцін байцы і камандзіры праяўлялі масавы гераізм. Так, за мужнасць пры вызваленні Магілёва 28 салдат і афіцэраў розных нацыянальнасцей былі ўдастоены звання Героя Савецкага Саюза, а усяго за фарсіраванне Дняпра і вызваленне горада гэта званне атрымалі 92 воіны 2-га Беларускага фронта. За прарыў варожай абароны і фарсіраванне сходу Заходняй Дзвіны Героямі Савецкага Саюза сталі 145 воінаў 1-га Прыбалтыйскага фронта. Сярод іх рускі – капітан М.Лугоўскі, украінец – сяржант У.Івашчанка, узбек – радавы Р.Азімаў, удмурт – сяржант К.Шакіраў, татарын – капітан Б.Анціміраў і інш.

Пры вызваленні Беларусі Чырвоная Армія панесла велізарныя страты, загінула больш 600 тысяч чалавек, у тым ліку 522 – Героі Савецкага Саюза, прадстаўнікі 29 нацыянальнасцей. Сярод іх – рускія У.Мартынаў, С.Роман, Б.Бахараў, украінцы У.Карпенка, С.Супрун, туркмен К.Азолаў, татарын Т.Ібрагімаў, мардвін П.Куманаў, чуваш Г.Аляксееў, башкір К.Ахметшын, беларус П.Акуцыенак і многія іншыя. У памяць пра тыя векапомныя дні на 21-ым кіламетры Масковскай шашы ўзняўся Курган Славы – даніна ўдзячнасці беларускага народа сваім вызваліцелям.

У той жа час 1,3 млн. беларусаў змагалася на франтах вайны. Многія з іх здзейснілі баявыя подзьвігі пад Масквой і Ленінградам, Сталінградам і на Курскай дузе, пры вызваленні іншых абласцей і рэспублік. За гераічныя подзьвігі 4 беларусы сталі двойчы Героямі Савецкага Саюза, 443 – Героямі Савецкага Саюза, больш 300 тысяч савецкага Саюза, узнагароджана ардэнамі і медалямі 65 сталі поўнымі кавалерамі Ордэна Славы, 14 паўтарылі подзьвіг А.Матросава, І.Авекаў, Л.Муравіцкі, М.Пінчук здзейснілі паветраны таран, гамельчанін І.Катунін у 1944 г. паўтарыў подзьвіг М.Гастэлы (11; 150).

Вялікае воінскае майстэрства і асабістую храбрасць паказаў у баях пад Масквой сын беларускага народа Л.Даватар. Камандуючы кавалерыйскім корпусам, у склад якога ўваходзілі прадстаўнікі многіх народаў, ён правёў глыбокі рэйд па тылах праціўніка. Аб ім і яго корпусе хадзілі легенды. Толькі ў першы перыяд контрнаступлення коннікі Л.Даватара акружылі і поўнасцю разбілі цэлую фашысцкую дывізію. На жаль, у снежні 1941 г. Л.Даватар у баі ля населеннага пункта Палашкіна загінуў смерцю героя. Пасля яго смерці корпус узначаліў сын Асеціі У.Плііеў.

Ураджэнка Расоншчыны З.Тусналобава за 8 месяцаў баявых дзеянняў вынесла з поля боя 128 параненых. У баях на Курскай



дузе яна сама была паранена і абмарожана, у выніку чаго ей былі ампутаваны рукі і ногі, але, нягледзячы на гэта, і ў пасляваенны час яна займалася актыўнай грамадскай дзейнасцю, была ганаровым грамадзянінам г.Полацка. З.Тусналобава – Герой Савецкага Саюза, узнагароджана вышэйшай узнагародай міжнароднага камітэта Чырвонага Крыжа – медалём Флорэнс Націнгейл (12; 45). Многія з іх, выконваючы свой свяшчэнны абавязак, загінулі, а іх подзьвігі пасмяротна ацэнены званнем Героя Савецкага Саюза. Так, у баях пад Ленінградам загінулі ўраджэнцы Магілёўшчыны лётчык А.Антоненка, які за 34 дні баёў збіў 11 самалётаў ворага, вядомы снайпер Ф.Смалячкоў, на Курскай дузе здзейсніў свой подзьвіг лётчык С.Гаравец, які ўступіў у бой з 20 гітлераўскімі самалётамі, збіўшы пры гэтым 9, пры абароне Крыма загінулі лётчыцы П.Гельман і Г.Дакутовіч, у баях за Украіну загінуўА.Волах, Латвію – П.Рубіс, П.Купрыянаў, Літву – Р.Кавалёў і інш.

Многія прадстаўнікі Беларусі ўдзельнічалі і ў вызваленні сваіх родных мясцін, здзейсніўшы пры гэтым шматлікія подзьвігі. Сярод іх можна назваць ураджэнца Клічава, танкіста П.Крываноса, ураджэнца Міншчыны капітана А.Чарныша, выхадца са Жлобіншчыны М.Барташова, ураджэнца г.п.Шуміліна П.Акуцыёнка і інш.

Зямля беларуская шчодра паліта крывёй сыноў і дачок усіх народаў Савецкага Саюза. У рэспубліцы няма такога месца, якое не было б сведкам народнага подзьвігу і няма месца, дзе б гэтыя подзьвігі не ўшаноўвалі. Сягоння на Беларусі створана каля 8500 мемарыяльных комплексаў, помнікаў і абеліскаў, каля 5500 брацкіх магіл, тых, хто загінуў, у тым ліку і пры вызваленні Беларусі (13; 2).


1. 45 лет Великой Победы: итоги и уроки. – Тезисы докладов и сообщений межвузовской научно-теоретической конференции 7.04. 1990. Гродно, 1990.
2. Артемьев А.П. Братский боевой союз народов СССР в Великой Отечественной войне. М., 1975.
3. 45 лет Великой Победы: итоги и уроки. – Тезисы докладов и сообщений межвузовской научно-теоретической конференции 7.04. 1990. Гродно, 1990.
4. Народная асвета, 1975, № 5.
5. Энцыклапедыя гісторыі Беларусі, т. 2. Мн., 1994.
6. Звязда, 1989, 6 красавіка.
7. Ковшаров Н.Д. Беларусь в годы Великой Отечественной войны (1941-1945). Мн., 1997.
8. Иосько М.М. Белоруссия и Узбекистан. Мн., 1970.




Репозиторий БГПУ

9. Звязда, 1989, 6 красавіка.
10. Киселёв Ц.Я. Советская Белоруссия. М., 1982.
11. Энцыклапедыя гісторыі Беларусі, т. 4. Мн., 1997.
12. Энцыклапедыя гісторыі Беларусі, т. 6. Мн., 2001.
13. Лемяшонак У. Вызваленне Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў (верасень 1943 – ліпень 1944) // Беларускі гістарычны часопіс, 2004, № 6.



## К ВОПРОСУ ОБ ИТОГАХ ВЕЛИКОЙ ОТЕЧЕСТВЕННОЙ ВОЙНЫ И ЦЕНЕ ПОБЕДЫ

**Москалёв В.Г. (Минск)**

К опыту и итогам второй мировой войны, её центрального события – Великой Отечественной войны – люди обращаются вновь и вновь. И это определяется не только тем, что СССР в союзе с коалицией разгромил блок фашистских государств. Наиболее далеко идущим ее влиянием является вызванное войной ускорение освобождения государств от колониальной зависимости, создание мировой системы социализма, образования нового мирового порядка и контроля Организации Объединенных Наций за ним. Прогрессивное человечество вот уже 60 лет ведёт непрерывную борьбу за предотвращение войн, мировых конфликтов.

Вторая мировая война создала смертельную угрозу всем народам в мире и каждому отдельному человеку в стране. Она вызвала морально-политический подъем масс, невиданный даже в годы предвоенных пятилеток, огромный энтузиазм народа и личную заинтересованность его в победе. Это явилось источником массового героизма людей на фронте, трудового подвига в тылу, развертывания борьбы партизан и подпольщиков на оккупированной врагом территории.

Война потребовала мобилизации всех средств и сил страны, высокой дисциплины и подчинения всех сторон жизни главной цели – победы над врагом. Моральный и духовный подъем всех народов, энтузиазм масс и личная заинтересованность людей в победе, организационные мероприятия правительства СССР позволили в короткий срок в сложной обстановке провести реорганизацию политического, экономического и военного руководства страной, перестроить экономику на военный лад, развернуть многомиллионные вооруженные силы. Лозунг «Все для фронта, все для победы!» получил конкретное материальное и духовное содержание. Огромен вклад рабочего класса в достижении победы в войне. Более трети рабочих и служащих были призваны в армию. Их место заняли молодежь, женщины, пенсионеры. СССР, имея в 3-4 раза меньше станков, металла, электроэнергии, временно потеряв территорию, на которой до войны проживало 45% населения страны, где производилось 33% валовой продукции промышленности и 54% валовой продукции сельского хозяйства, произвел в годы войны оружие и военной техники в 2 раза больше, чем фашистская Германия.

Не менее важен вклад в достижение победы крестьянства нашей страны. Большинство мужского населения деревни было мобилизо-



Репозиторий БГПУ